УДК 81'42

Цясленка А.Р.

АГУЛЬНЫЯ КЛАСІФІКАЦЫІ АФАРЫЗМАЎ У АЙЧЫННАЙ І ЗАМЕЖНАЙ ФІЛАЛОГІІ

У кожнай галіне філалогіі, дзе даследуюцца афарызмы, распрацавана ўласная класіфікацыя афарыстычных выказванняў у адпаведнасці з пэўнымі крытэрыямі. Да літаратуразнаўчых можна аднесці класіфікацыі М.Л. Гаспарава, М.Н. Эпштэйна, Н.Ц. Федарэнкі і Л.І. Сакольскай, да лінгвістычных – В.Р. Кастамарава і Я.М. Вершчагіна, С.Г. Гаўрына, Я.Я. Іванова, Н.М. Шарманавай. «Неаднародныя па сваім паходжанні, структуры, семантыцы і спосабах функцыянавання афарызмы сістэматызуюцца рознымі даследчыкамі ў тэрмінах розных філалагічных дысцыплін з дапамогай самых разнастайных крытэрыяў» [2, с. 196]. Адсутнасць агульнапрынятай уніфікаванай класіфікацыі афарызмаў па іх асноўных тыпах з'яўляецца актуальнай праблемай сучаснага мовазнаўства.

ный архив ГГУ имени А.А.

Акадэмік М.Л. Гаспараў дыферэнцыруе ўсе афарызмы на два вялікія класы з пункту погляду невызначальнасці ці вызначальнасці іх аўтара. Першыя – афарызмы фальклорныя (прыказкі і прымаўкі) – адрозніваюцца прынцыповай немагчымасцю вызначэння іх аўтара. Другія – літаратурныя (гномы, сентэнцыі, апаф(т)эгмы, хрыі) – маюць рэальнага або патэнцыяльнага аўтара. Так, гномы ці сентэнцыі даследчык вызначае як афарызмы, у якіх не называецца імя аўтара; апаф(т)эгмы – гэта афарызмы, што прыпісваюцца пэўнай асобе; афарызмы пэўнай асобы ў пэўных абставінах адносяцца да хрый. Па-за межамі двух названых класаў М.Л. Гаспараў вылучае максімы – афарызмы маральнага зместу. Відавочна, што аднаго крытэрыя вызначальнасці аўтарства недастаткова, каб ахапіць усе існуючыя групы афарызмаў.

Класіфікацыя афарызмаў па іх геналагічна-семантычных адрозненнях належыць М.Н. Эпштэйну. Унутры афарыстыкі як жанра самастойнай слоўнай творчасці вылучаюцца такія разнавіднасці афарыстычных выказванняў, як сентэнцыі, максімы, гномы, хрыі. Сентэнцыі і максімы адрозніваюцца сваёй тэарэтычнай і практычнай скіраванасцю, патрабуюць згоды і выканання, змяшчаюць вывад і прадпісанне. Гномы – павучэнні, звычайна вершаваныя і ананімныя, аднак іншы раз выказаныя ад імя свайго аўтара. Хрыі перадаюць выслоўі мудрацоў у кантэксце біяграфічнага ці анекдатычнага апавядання аб іх.

Найбольш распрацаванай класіфікацыяй афарызмаў у літаратуразнаўстве з'яўляецца класіфікацыя Н.Ц. Федарэнкі і Л.І. Сакольскай. У іх манаграфіі, прысвечанай тэорыі афарызма як прадукту і спосабу мастацкай слоўнай творчасці, прапануецца «дыферэнцыяцыя афарызмаў, у аснову якой пакладзены цэлы комплекс гетэрагенных крытэрыяў» [2, с. 198]. Па-першае, усе афарызмы адрозніваюцца паводле іх тэматыкі, якая з цягам часу стала даволі шырокай і разнастайнай. Яны падзяляюцца на грамадска-палітычныя, этычныя, філасофскія, педагагічныя, жыццёва-бытавыя і інш. У кожным з гэтых напрамкаў вылучаюць мноства больш вузкіх тэм. Напрыклад, эстэтычныя афарызмы аб мастацтве, творчасці, прыгажосці, жывапісу, архітэктуры і г. д. Існуюць т. зв. вечныя пытанні, якія маюць пазачасавы характар. Для афарызма ў гэтым выпадку важна не навізна думкі, яны могуць і паўтарацца, а слоўная форма і ўмелае выкарыстанне стылістычных і эмацыянальных сродкаў. Усе афарыстычныя выказванні размяжоўваюцца на т. зв. адасобленыя (або самастойныя) афарызмы (як аўтаномныя тэксты), якія ўваходзяць у творы, што складаюцца толькі з афарызмаў, і ўводныя афарызмы (як інтэртэксты), што вылучаюцца з неафарыстычных тэкстаў розных літаратурных жанраў. І першыя, і другія, у сваю чаргу, на падставе рытмічнай і нерытмічнай арганізаванасці слоў падзяляюцца на афарызмы паэтычныя («афоравершы») і афарызмы ў прозе. Апошнія ў залежнасці ад іх лексічнага і сінтаксічнага аб'ёму дыферэнцыруюцца на ўласна афарызмы і т. зв. афарыстычныя выказванні («афорвыказванні»).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У 1990-я гады і ў пачатку XXI стагоддзя вывучэнне афарызмаў набывае якасна новы напрамак. Афарызм разглядаецца як прадукт і спосаб маўленчамысленчай дзейнасці чалавека, а афарыстыка вызначаецца як самастойная лінгвістычная дысцыпліна. Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што падобныя думкі выказвалі даследчыкі яшчэ ў 1970-я гады, аднак толькі ў 1990-х гадах быў дасканала акрэслены т. зв. «лінгвістычны погляд на афарызмы як адзінкі маўлення і элементы моўнай сістэмы».

У аснову сваёй класіфікацыі афарызмаў як адзінак маўлення і элементаў моўнай сістэмы В.Р. Кастамараў і Я.М. Верашчагін паклалі дзве прыметы (масавая ўзнаўляльнасць і наяўнасць другога, пераноснага зместу), згодна з якімі ўсе афарызмы падзяляюцца на маўленчыя (ці індывідуальныя) і моўныя (ці масавыя). Да першых даследчыкі адносяць афарыстычныя мастацкія тэксты і цытаты – неклішыраваныя афарызмы і пад., да другіх – прыказкі, крылатыя выразы, заклікі, дэвізы, лозунгі, агульнавядомыя грамадска-філасофскія формулы і навуковыя фармулёўкі і пад. «Спробы апісання афарызма ў межах функцыянальна-семантычнай тыпалогіі выказвання, нягледзячы на істотныя метадалагічныя супярэчнасці, дазволілі шчыльна наблізіцца да разумення афарызма, па-першае, як цэласнага лінгвістычнага аб'екта, па-другое, як спецыфічнай з'явы мовы і маўлення, і па-трэцяе, як лінгвістычнай катэгорыі (сістэмна-моўнага ўтварэння)» [3, с. 7]. Даследчыкі выключаюць індывідуальныя афарызмы з ліку адзінак мовы, але пры гэтым прызнаюць магчымым пераход індывідуальнага афарызма ў масавы. Масавая ўзнаўляльнасць, па сутнасці, вельмі суб'ектыўны крытэрый для размежавання крылатых выразаў і індывідуальных афарызмаў. Так, мы маем толькі некалькі дзясяткаў крылатых выразаў, якія вядомыя ўсім і шырока выкарыстоўваюцца ў маўленні. На нашу думку, нельга выключаць, асабліва пры лінгвакраіназнаўчым апісанні мовы (у межах якога была сфарміравана дадзеная класіфікацыя), індывідуальныя по іх паходжанню афарызмы з ліку элементаў моўнай сістэмы.

Яшчэ адна класіфікацыя афарызма як эталоннага знака мовы прапанавана Н.М. Шарманавай. Статус афарызмаў вызначаецца паводле іх семіятычнай і лінгвальнай прыроды. Лінгвальныя асаблівасці афарыстычных выказванняў разглядаюцца ў межах пяці аспектаў – уласна семантычнага, фармальна-граматычнага, семантычна-сінтаксічнага, камунікацыйнага і тэкставага [6, с. 2]. Паводле семантычнай структуры афарызмы дыферэнцыруюцца на апазітыўныя і неапазітыўныя. Ступень выяўленасці зместавай дамінанты ляжыць у аснове размежавання афарызмаў на лагічныя і вобразныя; па форме адлюстравання рэчаіснасці афарызмы падзяляюцца на рацыянальныя і парадаксальныя. Па структуры ўсе афарыстычныя выказванні класіфікуюцца на эквіваленты простага сказа, складанага сказа і звышфразавага адзінства. Дадзеная класіфікацыя адлюстроўвае нераспрацаванасць тэрміналагічнай асновы вывучэння афарыз-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ма: большасць паняццяў, якія выкарыстоўваюцца для азначэння класаў афарыстычных выказванняў, не з'яўляюцца ўласна лінгвістычнымі.

Асобна варта адзначыць класіфікацыю афарызма як гетэрагеннага паводле структуры і спосабаў функцыянавання лінгвістычнага аб'екта, прапанаваную Я.Я. Івановым. Пры сістэматызацыі афарыстычных выказванняў даследчык выкарыстоўвае «комплекс іерархічна ўпарадкаваных гетэрагенных крытэрыяў». У класіфікацыі ахопліваюцца ўсе «лінгвістычна значныя агульныя разнавіднасці афарызмаў», вылучаюцца «асноўныя (агульнакатэгарыяльныя) класы афарыстычных адзінак», дакладна вызначаюцца «дыферэнцыяльныя прыметы кожнага класа» [3, с. 8]. У якасці такіх дыферэнцыяльных прымет Я.Я. Іваноў вылучае: непрэцэдэнтны vs. прэцэдэнтны характар функцыянавання ў маўленні, камунікацыйную аўтаномнасць vs. неаўтаномнасць, стылістычна-геналагічную аформленасць vs. неаформленасць выказвання як літаратурнага твора, індывідуальна-маўленчы vs. агульнамоўны характар узнаўлення, наяўнасць vs. адсутнасць лакальнай асацыяцыі з крыніцай паходжання, прамое vs. пераноснае агульнае значэнне, матываванасць vs. нематываванасць агульнага значэння. Паводле першага крытэрыя, усе афарызмы падзяляюцца на два лінгвістычна значных класа – прэцэдэнтныя і непрэцэдэнтныя. Непрэцэдэнтныя афарыстычныя выказванні ствараюцца непасрэдна ў канкрэтным маўленчым акце. Паводле камунікацыйнай аўтаномнасці ці неаўтаномнасці афарызма як маўленчага твора афарыстычныя выказванні функцыянуюць адпаведна або ў выглядзе аўтаномнага тэксту, або толькі як элементы тэкстаў неафарыстычнага характару. Сярод афарызмаў, што ствараюцца як тэксты, адрозніваюцца афарызмы як літаратурныя тэксты і афарызмы як тэксты масавай камунікацыі грамадска-палітычнага, сацыяльна-культурнага і побытавага прызначэння. Прэцэдэнтныя афарыстычныя выказванні ўзнаўляюцца ў маўленні па-за кантэкстам іх аўтарскага ўжывання. Па ступені распаўсюджанасці сярод іх вылучаюць індывідуальна-маўленчыя і агульнамоўныя. Усе агульнамоўныя афарызмы па прымеце наяўнасці ці адсутнасці лакальнай асацыяцыі з канкрэтным аўтарам ці пэўным літаратурным творам падзяляюцца на крылатыя выразы-афарызмы і афарызмы-парэміі. Сярод афарызмаў-парэмій вылучаюцца тыя, што здольны ўжывацца ў пераносным сэнсе – афарыстычныя прыказкі, і тыя, што маюць толькі прамое значэнне – афарыстычныя прымаўкі. Афарыстычныя прыказкі, у сваю чаргу, падзяляюцца на афарызмы-ідыёмы і афарызмы-не ідыёмы. Такім чынам, дадзеная класіфікацыя ахоплівае ўсе лінгвістычна значныя агульныя разнавіднасці афарыстычных выказванняў (разрознена прадстаўленыя і ў іншых класіфікацыях). Яна дазваляе разглядаць і даследаваць афарызм не як фразеалагічную ці парэміялагічную адзінку (што значна звужае змест самаго паняцця «афарызм»), але і як самастойную моўную і маўленчую адзінку.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Літаратура

1 *Гаспаров, М.Л.* Афоризм / М.Л. Гаспаров // Литературный энциклопедический словарь / под общ. ред. В.М. Кожевникова, П.А. Николаева. – М.: Сов. энциклопедия, 1987. – С. 43.

2 *Іваноў, Я.Я.* Асноўныя класы афарызмаў (да праблемы сістэматызацыі афарыстычнага матэрыялу) / Я.Я. Іваноў // Фразеология германских, романских и славянских языков: сб. науч. статей: вып. 1 / под ред. Е.Е.Иванова. – Могилев: МГУ им. А.А.Кулешова, 2009. – С. 196–230.

3 *Іваноў Я.Я.* Дыферэнцыяльныя прыметы афарызма: аўтарэф. дыс. …канд. філал. навук: 10.02.19 / Я.Я. Іваноў; Беларускі дзярж. ун-т. – Мінск, 2004. – 23 с.

4 *Костомаров, В.Г.* О пословицах, поговорках и крылатых выражениях в лингвострановедческом учебном словаре / В.Г. Костомаров, Е.М. Верещагин // *Фелицына. В.П.* Русские пословицы, поговорки и крылатые выражения (лингвострановедческий словарь) / В.П. Фелицына. Ю.Е. Прохоров; под ред. Е.М. Верещагина, В.Г. Костомарова. – М.: Русский язык, 1979. – С. 3–17.

5 *Федоренко, Н.Т.* Афористика / Н.Т. Федоренко, Л.И. Сокольская. – М.: Наука, 1990. – 419 с.

6 *Шарманова, Н.М.* Українська афористика: структурно-семантичний та функціональний аспекти: автореф. дис. …канд. філол. наук: 10.02.01 / Н.М. Шарманова; Харківскі нац. ун-т ім. В.Н. Каразіна. – Харків, 2005. – 19 с.

7 *Эпштейн, М.Н.* Афористика / М.Н. Эпштейн // Литературный энциклопедический словарь / под общ. ред. В.М. Кожевникова, П.А. Николаева. – М.: Сов. энциклопедия, 1987. – С. 43–44.

8 Языковая природа афоризма: очерки и извлечения: пособие / сост., общ. ред., предисл. и вступ. статья Е.Е. Иванова. – Могилев: МГУ им. А.А.Кулешова, 2001. – 440 с.

ронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Куле